УДК 9 (476)

# Роль кірмашоў у эканамічным і культурным жыцці Беларусі

Давідовіч А.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Кірмаш – гэта святочна абстаўленая форма арганізацыі гандлю, пры якой торг адбываўся перыядычна ў пэўнай мясцовасці.

Кірмашы ўзніклі ў перыяд сярэднявечча. Дазвол на іх адкрыццё давалі магдэбургскае права, прывілеі вялікіх князёў ВКЛ, указы царскага ўрада. Звычайна кірмашы прымяркоўваліся да праваслаўных свят і большасць з іх праходзіла з вясны да восені.

На Беларусі першыя кірмашы афіцыйна зафіксаваны дазволамі ў Гродне – з 1496г., Полацку – 1498г., Мінску – 1571г. і іншых. Росквіт кірмашоў прыйшоўся на XIX стагоддзе.

У XVIII – пачатку XIX стагоддзяў найбуйнейшыя кірмашы адбываліся ў Зельве, Свіслачы, Нясвіжы, Бешанковічах, Міры і іншых. Яны вылучаліся спецыялізацыяй гандлю: на адных гандлявалі ў асноўным сельскагаспадарчымі таварамі, на іншых - жывёлай, або прамысловымі вырабамі.

Буйныя кірмашы мелі міжнароднае значэнне і ўстанаўлівалі сувязі з суседнімі краінамі. Акрамя прадметаў мясцовай прамысловасці і сельскай гаспадаркі на іх дастаўлялася шмат тавараў з-за мяжы.

Кірмашы ўцягвалі ў эканамічна – культурны працэс вялізную масу насельніцтва. На іх з’язджаліся сяляне з навакольных вёсак. Прыязджалі гандляры і купцы з іншых беларускіх гарадоў і замежныя госці. Кірмашы былі не толькі гандлёвымі, але і своеасаблівымі грамадска - культурнымі мерапрыемствамі. На іх наладжваліся масавыя гульні, відовішчы, танцавальныя рауты і г.д.

Кірмашовае свята складалася з так званага кірмашовага тэатра : выступленняў скамарохаў, музыкантаў і батлейкі. Асноўнымі ўдзельнікамі выступленняў былі дрэсіроўшчыкі мядзведзяў, музыкі (скрыпнікі, дуднікі), акрабаты,фокуснікі і казачнікі. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў яны саступаюць сваё месца ў гандлі лаўкам і крамам.